# САКАЛІНЫ ПАЛЁТ

**Сустрэча з цікавым чалавекам**

НЕЎЗАБАВЕ — 16 красавіка — Вікенцію Раманавічу Нарбутовічу споўніцца семдзесят чатыры гады. Лепш бы, жартуе ён, пяцьдзесят, або, скажам, трыццаць пяць. Слухаю свайго субяседніка (ў спартыўным дамашнім касцюме ён, высокі і статны, вельмі падобны на альпініста), гляджу, як горда і трывала сядзіць на плячах яго прыгожая галава, і думаю, што можна быць старым і ў семнаццаць (часам здараецца такое) і заставацца непадуладным узросту ў восемдзесят. Маладосць жыве ў гэтым чалавеку невынішчальна, адольваючы хваробы, перамагаючы горыч маларухомасці з-за іх.

З першай мінуты ён здзівіў нешматслоўнай дабратой, неяк непрыкметна скараціў адлегласць паміж сабой, Ганаровым грамадзянінам горада Гомеля, і мной, проста адной з яго жыхарак, што я адразу адчула сябе ў гасцях быццам дома.

Напярэдадні гэтай сустрэчы ў размове аб першай пяцігодцы і яе героях сакратар гаркома партыі Нэлі Фёдараўна Іванова адным з першых назвала прозвішча Нарбутовіча і сказала, што ў тыя нялёгкія, але слаўныя гады калектыў «Гомсельмаша» выпусціў яго ў жыццёвы палёт, нібы сокала з рукава...

Як усё гэта было, Вікенцій Раманавіч?

— На «Гомсельмаш» я прыйшоў у сакавіку 1930 года. Да гэтага быў пастухом, падсобным рабочым, служыў у Чырвонай Арміі, потым працаваў токарам на Гомельскім заводзе «Пралетарый». З 1927 года — член Ленінскай партыі.

І вось накіравалі ў новы калектыў. Распытваю, вядома, што тут і як. І даведваюся, што менш, чым за два гады да майго прыходу, калі я служыў у арміі, ля галоўнага катлавана гэтай новабудоўлі першай пяцігодкі адбыўся масавы мітынг. Пад урачыстыя гукі «Інтэрнацыянала» лепшая брыгада на чале з камуністам Радзіёнам Уманем паклала ў фундамент зборачнага цэха першы камень. На ім быў такі надпіс: «29 ліпеня 1928 года. Дзень закладкі завода». А будаўнікі па старой прывычцы паклалі на гэтую глыбу сярэбраную манету.

Першыя крокі былі нялёгкімі. Памятаю, прыбыў у наш цэх каруселвны станок з Германіі. Прызнацца, не проста ён нам даўся. Чарцяжь амаль ніхто чытаць не ўмеў, арыентаваліся так-сяк па эскізу. Але не палохаліся — выручалі кемлівасць, жаданне ўсё зрабіць самім.

Мы вельмі ганарыліся, што «Гомсельмаш» праектавалі савецкія спецыялісты. Літаральна ўсё — ад пачатку да канца. Толькі праект будаўніцтва і мантаж ліцейнага цэха быў выканан у Германіі. Нямецкая фірма «Альбауг» прапанавала тады свае паслугі па гэтаму збудаванню з умовай плаціць за іх золатам. Партыйная арганізацыя завода, а яна была створана ў першыя ж дні яго будаўніцтва, звярнулася да ўсяго калектыву з заклікам узвесці ліцейны цэх сваімі сіламі, абысціся без іншаземцаў. Тады праз усю залу заводскай сталовай вісеў плакат: «Ліцейнаму цэху — ударныя тэмпы!»

Вось так усё і пачыналася. Нядаўна ў адным з вершаў я прачытаў такія радкі: «Все биографии в эпоху вплетены, каким бы цветом нитка ни плелась бы». Гэта можна сказаць пра кожнага з нас. Наша эпоха вызначана Кастрычнікам. А жыццё маё трывала пераплялося з лёсам «Гомсельмаша».

Вікенцій Раманавіч змоўк — задумаўся аб нечым. Я зразумела, што яму зусім не проста, тым больш у параўнальна кароткай гугарцы, расказаць пра гісторыю завода, І вырашыла спытаць, што, на яго думку, самае характэрнае ў першым савецкім пяцігадовым плане, пяцідзесяцігадовы юбілей якога мы будзем сёлета адзначаць. Ен усміхнуўся:

— Я — практык, не тэарэтык. А план гэты — шматгранны, баюся, што не змагу больш або менш кваліфікавана «ресшыфраваць» яго.

— А калі зірнуць на яго з пункту гледжання асабістага лёсу?

— Гэта іншая справа. На пытанне, пастаўленае такім чынам, мне адказваць значна лягчэй. Аб некаторых падзеях свайго жыцця я ўжо расказаў. Дадам, што выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР чацвёртага і пятага скліканняў, за поспехі ў працы і грамадскай рабоце ўзнагароджан двума ордэнамі «Знак Пашаны», медалямі, многімі граматамі. Асаблівы дзень у маім жыцці і 26 студзеня 1967 года, калі гемяльчане аказалі мне высокае давер'е, назваўшы Ганаровым грамадзянінам роднага горада. Я прайшоў шлях ад пастуха да памочніка дырэктара «Гомсельмаша» па кадрах і быту. Цяпер — персанальны пенсіянер рэспубліканскага змачэння.

А вось лёс маіх дзяцей. Старэйшы сын Барыс таксама працаваў на «Гомсельмашы», у спецыяльным канструктарскім бюро. Потым пайшоў у армію, пасля службы закончыў школу МУС, завочна — юрыдычны інстытут. Цяпер ён — палкоўнік, супрацоўнік нашага абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў. Анатоль — інжынер-канструктар на адным з заводаў Брэста, Уладзімір закончыў Гомельскі філіял Беларускага політэхнічнага інстыту- та, працуе на «Гомсельмашы», інжынер па электразварцы, загадвае лабараторыяй. А Тамара — зубны ўрач чацвёртай бальніцы нашага горада.

Аб чым усё гэта сведчыць? Не проста аб адной сям'і. А і аб тым, што наш першы пяцігадовы план і ўсе наступныя — гэта прынцыпова новая гаспадарчая сістэма. Яна карэнным чынам адрозніваецца ад любой вядомай нам сістэмы капіталістычнага гаспадарання. У нас зусім іншая мэтавая ўстаноўка. У чым яе сутнасць? Забяспечыць планамернае развіццё прадукцыйных сіл у інтарэсах усямернага павышэння дабрабыту і ўсе- баковага развіцця ўсіх членаў грамадства.

Хачу падкрэсліць, што чалавек працы, яго інтарэсы, яго гарманічнае раэвіццё заўсёды былі і застаюцца ў цэнтры сацыялістычнай планавай сістэмы. Першы пяцігадовы — тэта комплексны план. У ім навукова абгрунтаваны тэмпы і прапорцыі эканамічнага і сацыяльнага развіцця Краіны Саветаў. Паўтараю — і сацыяльнага. Вядома, у кожнай нашай пяцігодцы — сваё абічча і свая спецыфіка, але, як сказаў *Л.* І. Брэжнеў, «гэта выдатныя главы адной вялікай кнігі, якая расказвае аб гераічнай працы нашага народа ў імя сацыялізму і камунізму». А першыя яе старонкі пісаліся ў той час, аб якім мы сёння гаворым на прыкладзе «Гомсельмаша».

І як пісаліся! Дрэваапрацоўчы цэх быў пабудаван за тры месяцы. Ужо да канца 1928 года былі ўзведзены сцены галоўных карпусоў. У жніўні 1929 года сельмашаўцы сабралі першыя сі- ласарэзкі, а са снежня сталі даваць іх штомесячна па 80 штук. Гэты час і лічыцца часам нараджэння завода. Да канца 1930 года на заводзе працавала 1129 чалавек, а ўдарнікі складалі ўжо трэцюю частку калектыву. У гэтым жа годзе «Гомсельмаш» выканаў вытворчую праграму, заняў першае месца сярод прадпрыемстваў Беларусі і заваяваў пераходны Чырвоны сцяг Гомельскага гаркома партыі і Савета праф- саюзаў.

А *ў* цэлым будаўніча-мантажныя работы завяршыліся на заводзе ў кастрычніку 1932 года. У гэтыя гады яго прадукцыя ішла ва ўсе канцы краіны. Але ўсе гэтыя машыны працавалі ад коннага прываду, а ў гаспадарках ужо чакалі і патрабавалі іх на механічнай цязе.

У другой палавіне 1932 года Савецкі ўрад даручыў «Гомсельмашу» вырабляць новую сіласарэзку «Інтэрнацыянал». Гэта была першая сельскагаспадарчая машына айчыннай канструкцыі, якая павінна была прапаваць ужо ў агрэгаце з трак- тарам. І праз паўтара месяца машына пайшла ў масавую вы- творчасць!

І жніўня 1939 года ў Маскве адкрылася Усесаюзная сельска- гаспадарчая выстаўха. Ці памятаеце аб гэтым, Вікенцій Раманавіч?

Не толькі памятаю, сам у ёй удзельнічаў. Было нас ад завода 38 чалавек — дырэктар А. К. Генкін, начальнік механічнага цэха, мой даўні і цяперашні сябра П. Д. Гаранскі, старшы канструктар Ельнер (забыў яго імя і імя па бацьку), стаханаўцы Лосеў, Дагялаў, Барадоўскі і іншыя. Акрамя таго на выстаўку паехалі 27 нашых экскурсаводаў, каб даваць тлумачэнні па прадукцыі «Гомсельмаша».

Галоўвыстаўком узнагародзіў тады наша прадпрыемства дыпломам II ступені, пяццю тысячамі рублямі матацыклам — у той час ён быў вялікай навінкай! Некалькі таварышаў і я ў тым ліку былі адзначаны вялікімі сярэбранымі медалямі. Хочаце паглядзець гэтую маю рэліквію?

— Вельмі хачу.

Зоя Іванаўна, жонка Вікенція Раманавіча, прынесла з другога пакоя яго святочны касцюм, на якім ззялі шматлікія ўзнагароды, а сярод іх і прыгожы сярэбраны медаль, на адваротным баку яго былі словы «Перадавіку сацыялістычнай сельскай гаспадаркі». Я прачытала іх услых, а Вікенцій Раманавіч сказаў:

Яшчэ адно пацвярджэнне дружнага саюза Сярпа і Молата. Яго нельга ўявіць без сецыялістычнага спаборніцтва. Як зараз памятаю зараджэнне стаханаўскага руху. Іменна вялікая энергія стварэння вылучыла і Аляксея Стаханава, і Мікіту Ізотава, і Макара Мазая, і Пашу Ангеліну, і Пятра Крываноса, і многіх іншых. А на нашым заводзе, у механічным цэху, дзе я працаваў старшым майстрам, першы стаханаўскі рэкорд быў 8 кастрычніка 1935 года. Тады токар-камсамолец Мікалай Кавалёў выканаў зменнае заданне на 457 працэнтаў. Як гаворыцца, цяжкі толькі пачатак. І праз многа гадоў, пасля вайны ўжо, калі члены брыгады Пятра Селькіна прыйшлі да мяне параіцца, як ім лепш уключыцца ў спаборніцтва за права і ўменне працаваць і жыць па-камуністычнаму, я міжволі ўспомніў пачатак гэтага пачыну, самаадданую лрацу сваіх таварышаў па заводу — Парфірыя Дзмітрыевіча Гаранскага, Івана Іванавіча Старавойтава, Аляксандра Георгіевіча Платкоўскага, Яўгена Ерамеевіча Архіпенку, Ганну Іванаўну Шляхто і многіх іншых. Неэабыўныя гэта гады і незабыўныя людзі.

Пра сябе ж — толькі мімаходзь. Гэта ўжо іншыя ветэраны «Гомсельмаша» расказалі мне, што працаваў Вікенцій Раманавіч нястомна і многа, што калі стварылася на заводзе «школа ля станка», ён аддаваў ёй усе свае выхадныя дні і падрыхтаваў 200 чалавек. Сярод яго вучняў — былы стругальшчык механічнага цэха Васіль Піліпавіч Мухін, які ў гады Вялікай Айчыннай вайны стаў Героем Савецкага Саюза. Ды ці ўсіх назавеш?

А гады вайны — чым іх вымераць? В. Р. Нарбутовіч рваўся на фронт, а яму сказалі, што трэба эвакуіраваць завод у далёкі горад Курган, што на Таболе. На платформы ён распарадзіўся пагрузіць абсталяванне, а ў таварныя вагоны з пачатку скрыні з нарыхтоўкамі да мін, каб на новым месцы адразу выпускаць зброю па ворагу, з хатніх жа рэчаў узялі толькі пярыну і адзенне. На гэтыд скрынях „разам з ім ехала яго першая жонка Аляксандра Аляксандраўна з чатырма малымі, старэйшаму з якіх было восем гадоў, а малодшай дачцэ — восем месяцаў.

Там, у Кургане, было холадна і голадна. Цяжка хварэла жонка. А ён суткамі не адыходзіў ад перагрэтых станкоў за якімі працавалі падлеткі. І аднойчы прыйшла тэлеграма ад І. В. Сталіна са словам: падзякі Вікенцію Раманавічу за бездакорную працу ў імя перамогі над ворагам.

Ці думаў ён тады, што праз многа гадоў Беларускае таебачанне будзе ствараць фільм аб працы гомсельмашаўцаў у Кургане, і ён прыедзе ў гэты памятны горад ужо як госць і сустрэне тут многа-многа сваіх верных сяброў? Ці думаў ён тады, што часта будзе расказваць моладзі пра гады пяцігодак, што наперадзе ў «Гомсельмаша» другое нараджэнне. За якім ён цяпер уважліва сочыць, такая рэканструкцыя і такое будаўніцтва, што пасутнасці з'явіцца яшчэ адзін такі завод, які ўжо выпускае І будзе яшчэ больш выпускаць цудоўных камбайнау КСК-100. Гэта новае слова айчыннага машынабудавання, новы ўзлёт роднага для яго калектыву.

Мы гартаем альбомы, фотакарткі — іх мноства. На адных Вікенцій Раманавіч — у сям'і, на другіх — на сесіях Вярхоўнага Савета СССР, на трэціх — на святочных дэманстрацыях у калонах гомсельмашаўцаў, на чацвёртых — з дэлегацыяй у ГДР, горадзе Цытау — пабраціму Гомеля. Побач — часопіс на англійскай мове з вялікім артыкулам В. Р. Нарбутовіча аб яго шчаслівым лёсе і таксама фотаздымкамі. Тут жа — аўтарскае сведчанне № 139871 за калектыўнае вынаходства трактарнага ўніверсальнага прычэпа і многа іншых дакументаў-рэліквій. Яны — яскравае сведчанне гэтага вялікага

і цікавага жыцця. Але чыста па-жаночаму і па-чалавечаму хочацца яшчэ спытаць аб сямейным шчасці. Бачу, што яно сапраўднае і з неба не звалілася. Чыя тут заслуга?

— Відавочна, нарадзіўся я пад шчаслівай зоркай. Першая мая жонка была вернай сяброўкай. Неўзабаве пасля вайны пахаваў яе. Потым сустрэў Зою Іванаўну. Удзячны ёй, што не пабаялася ўвайсці ў мой дом, дзе трэба было замяніць маці чатыром дзецям. Жылі і жывем дружна, ніякіх асаблівых намаганняў для гэтага не прыкладаем. Ужо ўнукаў у нас некалькі і мы вельмі рады ім.

Тут у размову ўступіла Зоя Іванаўна. Яна сказала, што было ёй, канечне. нялёгка выхоўваць чатырох малых, але дабрата і клопаты мужа надавалі сіл, неслі ў дом многа радасцей, тую паўнату шчасця, якое нямысліма без працы, дапамогі адзін аднаму, узаемнай павагі.

І зноў падумалася: сокал — заўсёды сокал. Ведаю, што гэтыя словы не спадабаюцца Вікенцію Раманавічу — не любіць ён гучных фраз. Але іншае і ў галаву не ідзе. Да таго ж, ці дрэнна называць рэчы, учынкі сваімі імёнамі? Зрэшты, лепш «апраўдаюся» 16 красавіка, калі на хвіліну завітаю да Вікенція Раманавіча і Зоі Іванаўны з кветкамі, каб павіншаваць яго з днём нараджэння і пажадаць добрага здароўя і доўгай-доўгай маладосці. Павіншуйце яго і вы, дарагія гамяльчане, хто асабіста, хто ў думках, гэта ж так хораша, што жыве ў нашым горадзе такі чалавек, Ганаровы яго грамадзянін.

**З. ЗАЙЦАВА.**